**Крыніцы і літаратура**

1. Litwin, A. Problem Białorusi w oficjalnej polityce polskiej w latach 1918–1939 / A. Litwin // Spolczeństwo białoruskie, litowskie i polskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939–1945 / red. M. Giżejendskiej i T. Strzembosza. – Warzsawa : in.-t. studiów politycznych PAN, 1995. – 35 s.
2. Maliszewski, E. Białoruś w cyfrach i faktach / E. Maliszewski. – Piotryków : Wiadomości Polski, 1918. – 39 s.
3. Swiechowski, M. O program w stosunku do ziem Litewsko-białoruskich / Marjan Swiechowski. – Wilno : "Lux", 1920. – 30 s.
4. Wasilewski, L. W sprawie przyłączenia kresów wschodnich / L. Wasilewski. – Warszawa [б/в], 1919. – 26 s.
5. Hołówko, T. Perspektywy historyczne // Robotnik. – 1919. – 24 lutego. –28 s.
6. Nota delegacji polskiej na konferencji pokojowej o wschodnich granicach Polski (przesłana przewodniczącemu komisji terytorjalnej d. 3 marca 1919 r.) // Polityka polska i odbudowannie państwa. – Warszawa : nakładem ksęgarni Perzyński, Niklewicz, 1926. – Cz. 1 : Program terytorialny delegacji polskiej. – 533 s.
7. Akty i dokumenty dotyczące spraw granic Polski na konferencji pokojowej w Paryzu 1918–1919. – Paryż : [б/в], 1920. – S. 100–101.
8. Studnicki, W. Polnocno-wschodnie zieme dawnej Rzeczypospolitej Polskiej / W. Studnicki. – Warszawa : [б/в], 1919. – 27 s.
9. Pilsudski, J. List do L. Wasilteskiego 08.04.1919 / J. Pilsudski // Pisna zbiorowe : w 8 t. – Warszawa : Instytut J. Pilsudskiego, 1937. – T. 5. – S. 73–74.
10. Pilsudski, J. List do Ignacego Paderewskiego 04.05.1919./ J. Pilsudski // Pisna zbiorowe : w 8 t. – Warszawa : Instytut J. Pilsudskiego, 1937. – T. 5. – S. 80–81.
11. Pisna zbiorowe : w 8 t. – Warszawa : Instytut J. Pilsudskiego, 1937. – T. 5.– S. 80.
12. Taraszkiewicz, B. Białoruskie postułaty polityczne / B. Taraszkiewicz // Przymierze. – 1920. – 20 stycznia (№ 5). – S. 5–9.
13. Луцкевіч, А. І. Польская акупацыя ў Беларусі / А. І. Луцкевіч. – Мінск : "Полымя", 1992. – 19 с.

УДК 930(470):930(438):94:327(4)«1921-1923»

**М. М. Мязга**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ІНТАРЭСЫ РАСІІ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ Ў СУЧАСНАЙ РАСІЙСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

*У сучаснай расійскай гістарыяграфіі пры вывучэнні Версальскай сістэмы міжнародных адносін асаблівая ўвага надаецца вызначэнню ролі і месца Савецкай Расіі ў ёй. Расійскія гісторыкі робяць акцэнт на тым, што сярод заходніх палітыкаў не мелася адзінай палітычнай лініі ў адносінах да Расіі пры фарміраванні Версальскай сістэмы. Тым не менш, дамінуе пункт гледжання, згодна з якім краіны Антанты не былі зацікаўлены ў захаванні Расіі як адной з вядучых дзяржаў свету, яе тэрытарыяльнай цэласнасці. Іх палітыка прывяла да ператварэння Расіі ў «ізгоя» Версальскай сістэмы. Пры гэтым шэрагам даследчыкаў адзначаецца, што заходнія дзяржавы ўсё ж пакідалі за Расіяй апошняе слова пры вызначэнні яе межаў і не спяшаліся з прызнаннем ўскраінных дзяржаў.*

У адным з артыкулаў, апублікаваных групай аўтараў у «Весніку Томскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя», адзначаецца, што ў расійскай гістарыяграфіі

«застаецца адкрытым пытанне аб тым, ці было дакладнае разуменне ў краін Антанты ў ходзе выпрацоўкі Версальскага светапарадку важнасці ўключэння ў ствараемую сістэму Савецкай Расіі» [1, с. 106]. У расійскай гістарыяграфіі пры вывучэнні гісторыі Версальскай сістэмы адным з асноўных з'яўляецца канцэпт аб яе няўстойлівасці. У якасці значымага фактара, які абумовіў гэтую няўстойлівасць, як правіла, адзначаецца тое, што за рамкамі Версальскай сістэмы апынулася Расія. У дадзеным артыкуле пастаўлена мэта выявіць і ахарактарызаваць існуючыя ў расійскай постсавецкай гістарыяграфіі палажэнні, якія прадстаўляюць працэс стварэння Версальскай сістэмы з пункту гледжання ўліку інтарэсаў Расіі. Гэтая праблема пачала асабліва актыўна абмяркоўвацца расійскімі гісторыкамі з пачатку XXI ст., калі Расія стала прадпрымаць істотныя намаганні па аднаўленні сваіх геапалітычных пазіцый як вялікая дзяржава.

У працах расійскіх аўтараў адразу ж вызначаліся ацэнкі палітыкі «архітэктараў» Версальскай сістэмы ў адносінах да Расіі як супярэчлівай, але пры гэтым акцэнт усё ж рабіўся на ігнараванне расійскіх інтарэсаў. У 2004 г. была выдадзена манаграфія Анатоля Уткіна, сама назва якой «Прыніжэнне Расіі: Брэст, Версаль, Мюнхен» ужо вызначала асноўную канцэпцыю аўтара. Ён адзначае, што пазіцыя Захаду ў адносінах да Расіі пры фарміраванні Версальскай сістэмы вызначалася тым, што ён не мог даравацьёй сепаратны мір, адмову плаціць даўгі, нацыяналізацыю заходняй уласнасці. Але пры гэтым з тэксту манаграфіі не вынікае адназначная выснова аб імкненні Захаду раздзяліць Расію. А. І. Уткін піша, што заходнія палітыкі «ні ва ўнутраных дыскусіях, ні ў знешнепалітычных заявах не назвалі законным абвяшчэнне незалежнасці Фінляндыі, Украіны, прыбалтыйскіх дзяржаў, закаўказскіх рэспублік» [2, с. 290–291]. З іншага боку, ён адзначае, што Францыя гатовая была падтрымаць польскія прэтэнзіі ў дачыненні да Германіі, Літвы, Украіны і Расіі, бо ёй патрэбна была «максімальна моцная Польшча як фарпост французскага ўплыву ва Усходняй Еўропе», як бар'ер на шляху аднаўлення германскага эканамічнага і палітычнага ўплыву ў Расіі [2, с. 338]. Па сутнасці, лічыць А. І. Уткін, пазіцыю Францыі ў адносінах да Расіі вызначаў германскі фактар, і аслабленне Расіі не адпавядала французскім інтарэсам. Брытанія, наадварот, з расколам Расіі атрымлівала гарантыі бяспекі сваім важнейшым уладанням. Менавіта таму Лондан прызнаў незалежнасць Фінляндыі і прыбалтыйскіх дзяржаў, стаў «падштурхоўваць закаўказскія навафармаванні да самасцвярджэння». Даследчык спасылаецца на выказванне міністра замежных спраў Вялікабрытаніі Артура Бальфура на сустрэчы саюзнікаў 3 снежня 1918 г. аб нежаданні «бачыць межы Расіі ранейшымі ў Фінляндыі, балтыйскіх краінах, Закаўказзі і Туркестане» [2, с. 349]. А. І. Уткін адзначае, што Версальскі дагавор грунтаваўся на часовых суадносінах сіл і на стымуляванні малых нацыяналізмаў дзеля аслаблення Расіі і Германіі [2, с. 511]. Як найбольш прымальная для Расіі А. І. Уткіным прадстаўлена пазіцыя прэзідэнта ЗША Вудра Вільсана. Ён зыходзіў з таго, што пасля заканчэння вайны ў Расіі паўстане задача прыцягнення любога будучага расійскага ўрада «ў калектыў сусветнай супольнасці – Лігу Нацый, а не давядзенне Масквы да становішча сусветнага ізгоя». А. І. Уткін лічыць, што ў сваёй палітыцы ў адносінах да Расіі амерыканскі прэзідэнт зыходзіў з таго, што «стварэнне ж больш пэўнай структуры ўзаемаадносін паміж ЗША і Расіяй ўмацоўвала базіс міжнароднага парадку, у якім заходнееўрапейскім метраполіям даводзілася пацясніцца». Без Расіі было немагчыма сапраўднае еўрапейскае аднаўленне і новае сусветнае пераразмеркаванне роляў [2, с. 508].

Інтарэсы Расіі непасрэдна закраналіся пры вырашэнні на Парыжскай канферэнцыі польскага пытання. Расійскія гісторыкі, з аднаго боку, падкрэсліваюць, што на канферэнцыі пры вызначэнні ўсходніх межаў Польшчы дамінаваў прынцып аднаўлення яе ў этнаграфічных межах [3, с. 144]. З іншага боку, у расійскай гістарыяграфіі шырока прадстаўлены пункт гледжання, згодна з якім Польшча і Чэхаславакія ствараліся пераможцамі як сродак ціску на Савецкую Расію і Германію. Выкладаючы дадзены пункт гледжання, Віктар Зубачэўскі ў той жа час адзначае, што па гэтым пытанні сярод саюзнікаў

не было згоды. Так, брытанскі прэм'ер-міністр Дэвід Ллойд Джордж стаўку ў барацьбе з бальшавізмам рабіў на Германію, бачачы ў ёй таксама процівагу Францыі, і прыніжаў значэнне Польшчы як антысавецкага бар'ера. В. Вільсан у цэлым падтрымаў пазіцыю Вялікабрытаніі [4, с. 58, 59]. В. Л. Зубачэўскі лічыць, што дзяржавы, якія ўзніклі ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе ў перыяд працы Парыжскай канферэнцыі, былі ператвораныя дзяржавамі Антанты ў бар'ер паміж Германіяй і Расіяй і «санітарны кардон» супраць бальшавізму. Але ўжо ў 1920 г. польска-савецкая вайна паставіла пад сумнеў трываласць буфера-кардона. Аўтар рэзюмуе, што Версальская сістэма міжнародных адносін была пабудавана без уліку інтарэсаў Расіі і пераможаных краін, якім навязалі кабальныя ўмовы і тым самым пасеялі насенне Другой сусветнай вайны [4, с. 77].

Палажэнне аб антырасійскай накіраванасці Версальскай сістэмы развівае Наталля Нарачніцкая. У якасці важнейшай задачы брытанскай знешняй палітыкі ў XX ст. яна вызначае выцясненне Расіі і Германіі з Усходняй Еўропы. У прапанове Д. Ллойд Джорджа запрасіць на канферэнцыю на Прынцавых астравах усе ўрады, якія існавалі дэ-факта ў Расіі, Н. А. Нарачніцкая бачыць план расчлянення Расіі [5, с. 18]. Яна лічыць, што ў ходзе Парыжскай канферэнцыі ЗША і Вялікабрытанія імкнуліся да аддзялення ад Расіі перш за ўсё Прыбалтыкі і чарнаморскіх тэрыторый [5, с. 57, 66]. Пры гэтым віну за антырасійскія крокі стваральнікаў Версальскай сістэмы Н. А. Нарачніцкая ў значнай ступені ўскладае на бальшавікоў, якія, «заключыўшы сепаратны мір з Германіяй, ... вызвалілі саюзнікаў па Антанце ад дамоўленасцяў перадваеннага і ваеннага часу, чым тыя не прамінулі скарыстацца» [5, с. 101]. У 2018 г. Н. А. Нарачніцкая ў адным са сваіх артыкулаў паўтарыла тэзіс, што галоўная мэта Вялікабрытаніі і ЗША на Парыжскай канферэнцыі заключалася не ў тым, каб знішчыць бальшавізм, паколькі аднаўленне тэрытарыяльнага адзінства Расійскай імперыі, да чаго імкнуўся «Белы» рух, лічылася імі непажаданым [6, с. 333].

Генадзь Матвееў адзначае і спрыяльныя для Расіі моманты ў палітыцы заходніх дзяржаў. Ён звяртае ўвагу, што ў ноце Керзана Польшчы было адмоўлена ў валоданні Усходняй Галіцыяй. Акрамя таго, Варшаве далі зразумець, што ні пра якую незалежную ад Расіі Украіну не можа быць і гаворкі, у ліку ўдзельнікаў планаваўшыхся ў Лондане мірных перамоваў Украіна не згадвалася [7, с. 39]. Г. Ф. Матвееў у наступных сваіх працах развівае тэзіс аб наяўнасці ў палітыцы стваральнікаў Версальскай сістэмы станоўчых для Расія момантаў. Ён лічыць, што адносна праходжання расійска-польскай мяжы дзяржавы-пераможцы стаялі на пазіцыі Часовага ўрада, якая грунтавалася на этнічным прынцыпе. Тым самым яны не збіраліся прызнаваць абгрунтаванымі патрабаванні аднавіць Польшчу ў межах 1772 г. [8, с. 118]. Яшчэ ў адной сваёй больш позняй працы Г. Ф. Матвееў звяртаецца да пытання адпаведнасці інтарэсам Расіі «14 пунктаў» В. Вільсана. Аналізуючы гэты дакумент, ён паказвае, што яго палажэнні маглі «азначаць толькі адно: Расія будзе вырашаць свае нацыянальныя праблемы па ўласным меркаванні, а не на падставе безумоўна абавязковага для ўсіх дзяржаў права нацый на самавызначэнне [9, с. 39]. Але, з іншага боку, адзначае Г. Ф. Матвееў, Францыя працягвала на Парыжскай канферэнцыі праводзіць палітыку балансу сіл, што давала магчымасць новым дзяржавам вырашаць тэрытарыяльныя пытанні сілавымі метадамі як за кошт дзяржаў, якія прайгралі вайну, так і за кошт Расіі [9, с. 136]. Прарасійскія аспекты ў палітыцы краін Антанты адзначае і Міхаіл Нарынскі. Спасылаючыся, у прыватнасці, на ліст міністра замежных спраў Францыі А. Мільерана ў ліпені 1920 г. паверанаму ў справах у Вашынгтоне, ён паказвае, што кіраўнікі Антанты не падштурхоўвалі палякаў да ваеннага паходу супраць Савецкай Расіі. Нават у перыяд ваенных поспехаў Польшчы кіраўнікі краін Антанты заклікалі Варшаву да стрыманасці. Той жа А. Мільеран адзначаў, што падставай для вызначэння ўсходняй мяжы Польшчы павінна быць дэкларацыя Часовага ўрада Расіі 1917 г. [10, с. 32, 39].

В. А. Зубачэўскі ў сваіх даследаваннях працягвае развіваць канцэпцыю, у рамках якой доказвае несправядлівасць у адносінах да Расіі межаў, устаноўленых стваральнікамі

Версальскай сістэмы. На ягоную думку, нават у выпадку перамогі «Белага» руху ў Грамадзянскай вайне ўяўляецца малаверагодным, каб Расія «атрымала выгадную канфігурацыю заходніх межаў». Разам з тым, заходнія дзяржавы выкарыстоўвалі паражэнне «Белых» для апраўдання ўсталяваных для Расіі несправядлівых заходніх межаў [11, с. 305]. Кацярына Раманава ў сваю чаргу адзначае, што кансерватыўныя палітычныя погляды лідараў «Белага» руху, галоўнае – ідэал «адзінай і непадзельнай Расіі», не цалкам адпавядалі інтарэсам Вялікабрытаніі і ЗША. Яны былі не супраць прымяніць да Расіі прынцып нацыянальнага самавызначэння і тым самым «шмат у чым паралізаваць у перспектыве яе магчымую знешнепалітычную актыўнасць». Заходнія краіны аказалі падтрымку дзяржавам, якія ўзніклі ўздоўж ускраін Расіі, разглядаючы іх і як «санітарны кардон» супраць бальшавізму ў выпадку ўмацавання ў Расіі савецкай улады, і як перашкоду на шляху актыўнай знешняй палітыкі Расіі ў сферы інтарэсаў дзяржаў Антанты пры любым зыходзе Грамадзянскай вайны [12, с. 467, 468].

На думку Сяргея Лісцікава, планам заходніх палітыкаў садзейнічаў той «раздзелены стан расійскай дзяржавы», у якім яна знаходзілася да пачатку Парыжскай канферэнцыі. Ён лічыць, што дзеянні саюзнікаў па «акружэнню» бальшавікоў мелі на мэце не дазволіць ім захапіць эканамічна і стратэгічна значныя раёны, дзе адбывалася фарміраванне «сіл правапарадку» (поўдзень і поўнач Расіі, Сібір, прыбалтыйскія землі). Саюзнікі не былі адзіныя ў бачанні будучыні Расіі. В. Вільсан усё ж спадзяваўся на адраджэнне адзінай дэмакратычнай дзяржавы. Брытанцы бачылі Расію моцна ўсечанай і аслабленай за кошт «заахвочвання ўзнікшых у яе былых межах нацыянальных дзяржаў». Французы вагаліся паміж першым і другім пунктамі гледжання. С. В. Лісцікаў лічыць, што ідэя «акружэння» бальшавіцкай Расіі суседнімі з ёй рэспублікамі атрымала рэальнае ўвасабленне. Заходнія дзяржавы аказвалі падтрымку Фінляндыі: 5 мая 1919 г. яе незалежнасць прызналі Вялікабрытанія і ЗША. Падтрымка Варшаве выявілася ў тым, што заходнія дзяржавы санкцыянавалі ваенную акупацыю і грамадзянскае кіраванне палякамі Усходняй Галіцыі. Англічане ж, абапіраючыся на падтрымку ўрадаў закаўказскіх рэспублік, асвойваліся на скрыжаванні шляхоў паміж Сярэдняй Азіяй, Індыяй і Блізкім Усходам. С. В. Лісцікаў адзначае, што на момант завяршэння Парыжскай канферэнцыі «акружэнне Савецкай Расіі, досыць шчыльнае на яе заходніх рубяжах, адбылося» [13, с. 291, 292, 294, 295]. Праз год пасля публікацыі названага вышэй артыкула С. В. Лісцікава Міхаіл Мельцюхоў у сваёй манаграфіі абгрунтоўвае тэзіс, згодна з якім нельга адназначна казаць пра палітыку заходніх дзяржаў як накіраваную на аддзяленне ад Расіі яе ўскраін. Ён адзначае нежаданне Вярхоўнага Савета Антанты вырашаць прыбалтыйскае пытанне без згоды А. В. Калчака. Адказ вярхоўнага кіраўніка Расіі на ноту краін-саюзніц ад 26 мая 1919 г., які зводзіўся да таго, што канчатковае вырашэнне пытання аб незалежнасці Польшчы і Фінляндыі і аўтаноміі Прыбалтыкі будзе належаць Устаноўчаму сходу Расіі, задаволіў Антанту [14, с. 142].

У 2017–2019 гг. было выдадзена некалькі значных манаграфічных работ, у якіх разглядаецца месца Расіі ў Версальскай сістэме. Адным з найбольш фундаментальных даследаванняў сярод іх з'яўляецца манаграфія Ніны Быстровай «Рускае пытанне ў 1917 – пачатку 1920 г. Савецкая Расія і вялікія дзяржавы». Ужо ва «ўводзінах» аўтар вызначае ключавы аспект сваёй канцэпцыі, адзначаючы, што «моцнай Расіі ні Вялікабрытанія, ні Францыя, ні ЗША не жадалі і імкнуліся выкарыстоўваць яе ў сваіх геапалітычных і стратэгічных інтарэсах, аддалі б перавагу сыходу яе з сусветнай палітыкі як уплывовай сілы – вялікай дзяржавы». Расія, на думку аўтара, стала першай ахвярай тэрытарыяльнага перадзелу пасля Першай сусветнай вайны [15, с. 9, 10]. Н. Я. Быстрова не згаджаецца з тым, што палітыка В. Вільсана была нацэлены на захаванне Расіі як вялікай дзяржавы. На яе думку, сапраўдны сэнс інтрыгі прэзідэнта ЗША заключаўся ў тым, каб падключыць бальшавікоў да падрыву расійскай вялікадзяржаўнасці знутры пры захаванні, па меншай меры, намінальна, тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі [15, с. 48]. Н. Я. Быстрова адзначае, што «здабытая Польшчай і Румыніяй з дапамогай Францыі ўсходняя мяжа гэтых краін

станавілася трамплінам для ўварвання ў цэнтральную Расію». Аўтар лічыць, што французская ідэя апоры на Польшчу прадугледжвала ў якасці заходняй расійскай мяжы Днепр [15, с. 219]. На думку Н. Я. Быстровай, брытанскія і французскія палітыкі ўмела скарысталіся ўтварэннем на ўскраінных тэрыторыях былой Расійскай імперыі незалежных рэспублік, якія патрабавалі ўзмацнення за кошт яе зямель і заахвочвалі акружэнне будучай Расіі («белай» або «чырвонай») поясам дзяржаў, які стаў бы перашкодай для «рускай экспансіі» [15, с. 234]. У той жа час Н. Я. Быстрова адзначае: «Але ў прынцыпе Францыя жадала аднаўлення ў моцнай Расіі кансерватыўнага ладу для процідзеяння свайму рэйнскаму ворагу» [15, с. 220]. Аднак Вялікабрытаніі была зацікаўлена ў тым, каб на ўсходзе Еўропы не было моцнай дзяржавы, з інтарэсамі якога давялося б лічыцца [15, с. 260–261]. Пазбаўленне Расіі па ідэалагічных меркаваннях права ўдзельнічаць у стварэнні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы Н. Я. Быстрова лічыць памылкай, адзначае, што без удзелу Расіі праводзіліся новыя межы, зацверджаныя рашэннямі Парыжскай канферэнцыі. Аднак пры гэтым аўтар паказвае, што «вялікія дзяржавы ўсведамлялі немагчымасць стварэння стабільнага міжнароднага парадку, цалкам ігнаруючы расійскія інтарэсы. Было відавочна, што канчатковае тэрытарыяльна-дзяржаўнае ўрэгуляванне магчымае толькі пасля стабілізацыі становішча ў Расіі». Гэтым Н. Я. Быстрова тлумачыць асцярожны падыход саюзнікаў да вызначэння ўсходніх межаў Польшчы і Румыніі [15, с. 239, 240–241]. У сувязі з гэтым яна ўказвае на дэкларацыю заходніх дзяржаў ад 20 жніўня 1919 г. аб прызнанні незалежнасці краін Прыбалтыкі, у якой адзначалася, што канчаткова гэтае пытанне будзе вырашана пры ўрэгуляванні з Расіяй [15, с. 317]. Н. Я. Быстрова робіць выснову, што дзяржавамі Еўропы праводзілася палітыка дыскрымінацыі Расіі і абмежавання яе ролі ў міжнародных адносінах [15, с. 349].

Да пытання палітыкі Антанты ў адносінах да дзяржаў, якія ўзніклі на заходніх ўскраінах былой Расійскай імперыі, звяртаецца і Аляксандра Бахтурына. На яе думку, нявызначанасць сітуацыі ў Расіі ставіла пад сумнеў магчымасць удзелу дэлегацый нацыянальных урадаў у Парыжскай канферэнцыі. А. Ю. Бахтурына адзначае, што ў пачатку яе працы пазіцыі нацыянальных урадаў, якія імкнуліся да прызнання незалежнасці, не маглі быць падтрыманы дзяржавамі-пераможцамі па цэлым шэрагу прычын: незавершанасць Грамадзянскай вайны, адсутнасць адзінай улады ў Расіі, адсутнасць выразнай пазіцыі ў дачыненні да нацыянальных урадаў і нацыянальных дзяржаў у саюзных дзяржаў зімой 1919 г. [16, с. 294].

В. А. Зубачэўскі ў сваёй манаграфіі развівае канцэпцыю, згодна з якой «Версальская сістэма была пабудавана без уліку інтарэсаў Расіі і пераможаных краін, якім навязалі зусім кабальныя ўмовы і тым самым пасеялі насенне новых канфліктаў. Прычым, самі пераможцы не былі ўпэўненыя ў канчатковасці і справядлівасці пашытай імі ласкутнай карты Цэнтральнай Еўропы» [17, с. 126]. На думку названага аўтара, да пачатку 1920 г., насуперак дзяржаўным інтарэсам Расіі, адбылася сур'ёзная геапалітычная трансфармацыя яе «блізкага Захаду». В. А. Зубачэўскі лічыць, што дзяржавы Антанты не завяршылі тэрытарыяльнае размежаванне ў рэгіёне. Гэта ўсяляла ў Германію, Польшчу, Савецкую Расію надзею, што ўстаноўленыя межы маюць часовы характар і іх можна будзе змяніць дыпламатычнымі, а хутчэй – ваенна-палітычнымі метадамі [17, с. 164–165]. Лідзія Грышаева падкрэслівае ігнараванне ў рамках Версальскай сістэмы Расіі як галоўнага ўдзельніка Першай сусветнай вайны, члена Антанты. Умовы Версальскай сістэмы, на яе думку, не ўлічвалі інтарэсаў Расіі. Яна была аддзеленая ад Цэнтральнай і Заходняй Еўропы кардонам дзяржаў, створаных пераможцамі з мэтай прадухіліць небяспеку пранікнення бальшавізму ў Еўропу. Пераможаная ў вайне Германія і бальшавіцкая Расія сталі «парыямі Версалю», ізгоямі еўрапейскай супольнасці» [18, с. 364]. Аўтары манаграфіі «Вайна, рэвалюцыя, свет. Расія ў міжнародных адносінах. 1915–1925» лічаць, што адказнасць за дадзенае становішча Расіі ляжыць не толькі на заходніх палітыках але і бальшавіках з іх палітыкай сусветнай рэвалюцыі [19, с. 492].

Яўген Сяргееў дэталёва разглядае брытанскую палітыку па рускім пытанні ва ўмовах фарміравання Версальскай сістэмы. Ён робіць выснову аб наяўнасці розных пазіцый у адносінах да Расіі ў брытанскай палітычнай эліце. Таму многія рашэнні брытанскага кабінета насілі кампрамісны характар. Чэрчыль, Гардынг і Бьюкенен адкрыта выступалі за аднаўленне «адзінай і непадзельнай» Расіі фактычна ў ранейшых межах, робячы выключэнне толькі для Польшчы і Фінляндыі. Керзан, Мілнер, А. Чэмберлен і Сесіл, лічылі, што Расію неабходна раздрабніць на шэраг невялікіх дзяржаў, альбо, па меншай меры, стварыць па дузе яе еўрапейскіх і азіяцкіх межаў лімітрофныя ўтварэнні, якія здолелі б прадухіліць распаўсюджванне «бальшавіцкай заразы» на захад і ўсход. А галоўнае – гарантавалі б недатыкальнасць брытанскіх уладанняў у Азіі [20, с. 195, 197, 198]. Я. Ю. Сяргееў аналізуе ліст Керзана кіраўніку кабінета ад 12 верасня 1919 г., у якім ён пісаў, што аднаўленне «моцнай Расіі» будзе азначаць «рэвізію Версалю», бо «рускія захочуць вярнуць страчаныя тэрыторыі (Фінляндыю, Балтыю і Польшчу)». У такім выпадку Германія атрымала б шанец рэанімаваць свой уплыў у Еўропе. Я. Ю. Сяргееў адзначае, што Ллойд Джордж у лістападзе 1919 г. называў дзве ўмовы нармалізацыі адносін з бальшавікамі: прызнанне імі знешніх даўгоў; згоду на ўтварэнне суверэнных дзяржаў, уключаючы незалежную Сібір, на ўскраінах былой імперыі [20, с. 233]. Ён лічыў пажаданым стварэнне на тэрыторыі былой Расійскай імперыі некалькіх самастойных дзяржаўных утварэнняў, кожнае з якіх няздольнае пагражаць інтарэсам Брытаніі. Я. Ю. Сяргееў лічыць магчымым пагадзіцца з меркаваннем, існуючым у брытанскай гістарыяграфіі, што для многіх на Захадзе лепшым выбарам магла б стаць «чырвоная», але раздробненая і слабая Расія, чым «белая», але адзіная і моцная [20, с. 257]. У артыкуле, апублікаваным праз год пасля выдання манаграфіі, Я. Ю. Сяргееў робіць выснову, што стваральнікі Версальскай сістэмы імкнуліся паставіць любы расійскі ўрад, які атрымаў бы перамогу ў Грамадзянскай вайне, перад адбыўшымся фактам, і прымусіць яго прыняць на сябе абавязацельствы як удзельніка новай міжнароднай сістэмы. Гэта з’яўлялася галоўнымі прычынамі ігнаравання меркаванняў Масквы творцамі дагавораў у Парыжы і Вашынгтоне [21, с. 240].

Іскандэр Магадзееў разглядае палітыку Вялікабрытаніі і Францыі ў адносінах да Расіі ў перыяд фарміравання Версальскай сістэмы з пункту гледжання балансу сіл. Ён лічыць, што да 1920 г. найбольш «антысавецкі настроеныя дзеячы ў розных сталіцах еўрапейскіх дзяржаў» імкнуліся радыкальна змяніць баланс сіл у Еўропе шляхам адлучэння ад Расіі не толькі былых нацыянальных ускраін, «але і больш глыбокага адкідвання яе межаў на ўсход і раздраблення асноўнай тэрыторыі» [22, с. 95]. Пры гэтым у палітыцы дзяржаў Антанты спалучалася ідэалагічнае непрыманне бальшавізму з адстойваннем уласных прагматычных інтарэсаў. На думку І. Э. Магадзеева, дадзеная акалічнасць спараджала супярэчнасці ў палітыцы краін Антанты ў адносінах да ўскраінных дзяржаў. Так, старшыня Савета Міністраў і міністр замежных спраў Францыі А. Мільеран ў студзені 1920 г. быў гатовы даць палякам свабоду ў дасягненні іх мэтаў, але раіў ўстрымацца ад празмерных тэрытарыяльных амбіцый [22, с. 158, 159]. І. Э. Магадзееў лічыць, што моцная Польшча разглядалася Парыжам як неабходны элемент еўрапейскага «балансу сіл». Ж. Клемансо спрабаваў пераканаць брытанскага прэм'ер-міністра ў тым, што Антанта павінна ўзмацніць Польшчу з мэтай узвесці «загароду з калючага дроту» вакол Савецкай Расіі, каб не даць бальшавікам «ствараць складанасці за мяжой і стрымаць Германію ад устанаўлення адносін з Расіяй палітычнага або ваеннага характару». Але ў супрацьлегласць кіраўніку французскага ўрада, Д. Ллойд Джордж дапускаў магчымасць знікнення Польшчы з палітычнай карты Еўропы, бо лічыў больш важным дамовіцца з Савецкай Расіяй, хай нават і за кошт Польшчы [22, с. 176]. У цэлым, як лічыць І. Э. Магадзееў, Версальскі міжнародны парадак ва Усходняй Еўропе быў закліканы «зафіксаваць паражэнне Германіі і стратэгічнае адступленне Расійскай дзяржавы» [22, с. 208].

Шэраг аспектаў палітыкі Францыі ва Усходняй Еўропе ў перыяд фарміравання Версальскай сістэмы падымаецца аўтарамі калектыўнай манаграфіі «Вораг, праціўнік, саюзнік? Расія ў знешняй палітыцы Францыі ў 1917–1924 гг.». У дадзенай працы зроблена выснова, што ў французскіх палітычных колах у якасці стратэгічнай мэты бальшавікоў разглядаўся выхад Чырвонай Арміі да межаў іншых «ізгояў» Версальскага парадку: Германіі, Венгрыі, Аўстрыі. Інструментам для рэалізацыі гэтых планаў павінна была служыць канцэпцыя сусветнай рэвалюцыі. Менавіта для прадухілення такога ходу падзей і ствараўся «санітарны кардон» [23, с. 52]. Аўтары названага выдання згаджаюцца з пазіцыяй тых заходніх калегаў, якія лічаць, што мэта ў французскай палітыкі была адна – дэмакратычная і моцная Расійская федэрацыя, якая фактычна заставалася б у імперскіх межах як процівага Германіі. Гэта не спрыяла з'яўленню паміж Польшчай і Расіяй незалежных дзяржаў [23, с. 64]. Спрыяльным для Расіі было і тое, што, як указваецца ў названым выданні, Парыж рэкамендаваў Варшаве абмежавацца толькі «бясспрэчна польскімі тэрыторыямі» ў адпаведнасці з дэкларацыяй Парыжскай канферэнцыі ад 8 снежня 1919 г. [23, с. 78]. Далей аўтары манаграфіі «Вораг, праціўнік, саюзнік?» адзначаюць, што толькі ў студзені 1920 г. у сувязі з роспускам арміі Юдзеніча Францыя прапанавала прызнаць дэ-факта ўрады Эстоніі, Латвіі і Літвы, адкладаючы прызнанне дэ-юрэ да таго моманту, калі «канчатковы статус гэтых краін будзе замацаваны і забяспечаны агульным пагадненнем паміж саюзнікамі і законным рускім урадам» [23, с. 262]. Г. зн., у Парыжы захавалася традыцыйнае бачанне Расіі як «усходняй процівагі» Германіі [23, с. 373].

Пазітыўныя для Расіі моманты ў плане вызначэння яе заходніх межаў у палітыцы краін Антанты ў сваіх даследаваннях пачатку 2020-х гадоў адзначае і Г. Ф. Матвееў. Ён піша, што «пераможная кааліцыя і пасля вайны ўсяляк дапамагала Польшчы ўладкоўвацца ў новых межах, з адной толькі ўмовай, каб яе рубяжы больш ці менш адпавядалі этнаграфічнаму прынцыпу» [24, с. 19]. Ён паказвае, што з пункту гледжання заходніх дзяржаў Расія захоўвала ўсе правы на ўскраінныя тэрыторыі імперыі за «выключэннем былога Царства Польскага, “адпушчанага” на свабоду Часовым урадам» [24, с. 23]. Г. Ф. Матвееў адзначае, што дзяржавы Антанты «па-першае, адхілілі польскія прэтэнзіі на межы 1772 г.; па-другое, дэ-факта пакінулі за Расіяй права на вырашэнне пытання аб далейшым лёсе ўкраінскіх, беларускіх і літоўскіх зямель І Рэчы Паспалітай» [25, с. 134]. Г. Ф. Матвееў звяртае ўвагу на тое, што Д. Ллойд Джордж пагадзіўся з савецкім праектам мірнай дамовы з Польшчай нават пасля польскай перамогі ў Варшаўскай бітве за выключэннем пункта аб рабочай міліцыі [26, с. 168].

Адной з апошніх па часе апублікавання гістарыяграфічных крыніц, якія адносяцца да тэмы дадзенага даследавання, з'яўляецца манаграфія Аляксандра Вяршыніна. Аўтар падкрэслівае, што мадэль бяспекі ў рамках Версальскай сістэмы была створана без удзелу Расіі. Гэта здарылася перш за ўсё дзякуючы пазіцыі, якую займаў Ж. Клемансо [27, с. 20].

Такім чынам, расійская гістарыяграфія першай чвэрці XXI ст. не адрозніваецца разнастайнасцю канцэпцый, якія характарызуюць пазіцыю краін Антанты ў дачыненні да Расіі ў працэсе фарміравання Версальскай сістэмы. Сучасныя расійскія даследчыкі зыходзяць з таго, што «архітэктары» Версальскай сістэмы ў цэлым не былі зацікаўлены ў захаванні вялікадзяржаўных пазіцый Расіі ў рамках пасляваеннага міжнароднага парадку. Такі падыход не выключаў тэрытарыяльнага раздраблення Расіі. Аднак многія даследчыкі адзначаюць асцярожны падыход заходніх палітыкаў да праблемы прызнання незалежнасці новых дзяржаў, якія ўзніклі на ўскраінах былой Расійскай імперыі, вызначэння іх межаў, у прыватнасці, польскіх. Умацаванне ўлады бальшавікоў у Расіі дало падставу заходнім дзяржавам стварыць «санітарны кардон» на яе заходняй мяжы і выключыць з ліку заснавальнікаў Версальскай сістэмы. Расія прадстаўляецца многімі расійскімі аўтарамі ў якасці «ізгоя» гэтай сістэмы. Гэтыя падыходы не зведалі прыкметных змяненняў у разглядаемы ў артыкуле адрэзак часу развіцця расійскай гістарыяграфіі.

## Крыніцы і літаратура


1. Хахалкина, Е. В. Версальско-Вашингтонская система международных отношений глазами российских историков / Е. В. Хахалкина, А. В. Вагнер, О. Л. Ербахаев, П. А. Кулинич, Е. Е. Лукова // Вестник Томского государственного университета. История. – 2020. – № 63. – С. 104–109.

2. Уткин, А. И. Унижение России: Брест, Версаль, Мюнхен / А. И. Уткин. – М. : Изд-во Эксмо, Изд-во Алгоритм, 2004. – 624 с.

3. Яжборовская, И. С. Россия и Польша. Синдром войны 1920 г. / И. С. Яжборовская, В. С. Парсаданова. – М. : Academia, 2005. – 404 с.

4. Зубачевский, В. Л. Геополитическая ситуация на востоке Центральной Европы накануне и в период работы Парижской мирной конференции / В. Л. Зубачевский // Восточная Европа после Версаля. – СПб. : Алетейя, 2007. – С. 57–77.

5. Нарочницкая, Н. А. Великие войны XX века. Ревизия и правда истории / Н. А. Нарочницкая. – М. : Вече, 2010. – 352 с.

6. Нарочницкая, Н. Русская революция и мир в XX столетии: через призму «русского вопроса» на Парижской мирной конференции / Н. Нарочницкая // Брестский мир: история и геополитика. 1918–2018. – М. : Вече, 2018. – С. 270–314.

7. Матвеев, Г. Ф. Начало / Г. Ф. Матвеев // Белые пятна – черные пятна: спорные вопросы в российско-польских отношениях / под общей ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М. : Аспект Пресс, 2010. – С. 15–49.

8. Польша в XX веке. Очерки политической истории / Ответственный редактор А. Ф. Носкова. – М. : Издательство «Индрик», 2012. – 952 с.

9. Матвеев, Г. Ф. Польша в меняющемся политическом ландшафте Европы 1916–1920 / Г. Ф. Матвеев. – М. : Издатель Степаненко, 2024. – 232 с.

10. Наринский, М. М. Советско-польская война и Рижский мир 1921 года / М. М. Наринский // Забытый мир: Рижский договор 1921 года: интерпретации и споры. Под ред. С. Дембского, А. В. Мальгина (русское издание). – М. : ЗАО Издательство «Аспект Пресс», 2014. – С. 30–50.

11. Зубачевский, В. А. Советская Россия и начало геополитической трансформации Центрально-Восточной Европы (1918–1919 гг.) / В. А. Зубачевский // Первая мировая война, Версальская система и современность: сб. статей. Выпуск 2 / отв. ред. И. Н. Новикова, А. Ю. Павлов, А. А. Малыгина. – СПб. : СПбГУ, 2014. – С. 298–308.

12. Первая мировая война и судьбы европейской цивилизации / под ред. Л. С. Белоусова, А. С. Маныкина. – М. : Издательство Московского университета, 2014. – 816 с.

13. Листиков, С. В. Версаль и «русский вопрос»: идея «окружения» Советской России и ее эволюция / С. В. Листиков // Первая мировая война, Версальская система и современность: сб. статей. Выпуск 2 / отв. ред. И. Н. Новикова, А. Ю. Павлов, А. А. Малыгина. – СПб. : СПбГУ, 2014. – С. 290–298.

14. Мельтюхов, М. И. Прибалтийский плацдарм в международной политике Москвы (1918–1939 гг.) / М. И. Мельтюхов. – М. : Алгоритм, 2015. – 608 с.

15. Быстрицкая, Н. Е. Русский вопрос в 1917 – начале 1920 г. Советская Россия и великие державы / Н. Е. Быстрицкая. – М. : Институт российской истории РАН, 2017. – 368 с.

16. Бахтурина, А. Ю. Национальные правительства в России и «русский вопрос» на Парижской мирной конференции 1919 г. / А. Ю. Бахтурина // Первая мировая война, Версальская система и современность : сб. статей. Выпуск 4 / отв. ред. И. Н. Новикова, А. Ю. Павлов, А. В. Бодров, А. А. Малыгина. – СПб. : Издательство РХГА, 2017. – С. 323–336.

17. Зубачевский, В. А. Политика России в Центрально-Восточной Европе (первая треть XX века): Геополитический аспект / В. А. Зубачевский. – Омск : Изд-во ОмГПУ, 2018. – 396 с.

18. Гришаева, Л. Е. Советская Россия и Версальско-Вашингтонская система / Л. Е. Гришаева // Столетие Революции 1917 года в России. Научный сборник. Часть 1 / отв. ред. И. И. Тучков. – М. : Изд-во АО «РДП», 2018. – С. 363–372.
19. Война, революция, мир. Россия в международных отношениях. 1915–1925 : коллективная монография / под ред. А. В. Ревякина. – М. : Аспект Пресс, 2019. – 496 с.
20. Сергеев, Е. Ю. Большевики и англичане. Советско-британские отношения, 1918–1924 гг.: от интервенции к признанию / Е. Ю. Сергеев. – СПБ. : Наука, 2019. – 831.
21. Сергеев, С. Ю. Версальско-Вашингтонская система международных отношений как попытка создания бесконфликтного миропорядка / С. Ю. Сергеев // Исторические исследования – 2020. – № 15. – С. 237–247.
22. Магадеев, И. Э. В тени Первой мировой войны: Дилеммы европейской безопасности в 1920-е годы : Монография / И. Э. Магадеев. – М. : Аспект Пресс, 2021 . – 863 с.
23. Враг, противник, союзник? Россия во внешней политике Франции в 1917–1924 гг. / отв. ред. А. Ю. Павлов. Т. 2. – СПб. : Изд-во РХГА, 2021. – 892 с.
24. Матвеев, Г. Ф. Советско-польская война и два сценария для Восточной Европы / Г. Ф. Матвеев // Польша в борьбе за Восточную Европу 1920–2020. Сб. ст. / под общ. ред. В. Ю. Крашенинниковой. – М. : Издательство «Кучково поле», 2020. –С. 19–28.
25. Матвеев, Г. Ф. Польша в советской внешней политике с конца 1919 до 16 июля 1920 года / Г. Ф. Матвеев // Новая и новейшая история. – 2021. – № 3. – С 130–143.
26. Матвеев, Г. Ф. Польша в меняющемся политическом ландшафте Европы 1916–1920 / Г. Ф. Матвеев. – М. : Издатель Степаненко, 2024. – 232 с.
27. Вершинин, А. А. Неудавшийся союз: Военно-политическое сотрудничество СССР и Франции накануне Второй мировой войны (1930–1939 гг.) / А. А. Вершинин. – СПб. : Нестор-История, 2024. – 796 с.

УДК 930(410):94(438)«1919»:929

**Е. Н. Дубровко**
Гомельский государственный
университет имени Ф. Скорины

## ДЖЕЙМС ХЕДЛЭМ-МОРЛИ О ПОЛЬШЕ В 1919 ГОДУ

*Статья посвящена анализу взглядов английского историка, одного из экспертов британской делегации на Парижской мирной конференции 1919–1920 годов Джеймса Хедлэм-Морли на решение вопросов, возникавших в связи с восстановлением польского государства. На основе анализа писем и дневниковых записей периода коференции показано, что Дж. Хедлэм-Морли рассматривал эти вопросы в тесной связи с политикой в отношении Германии и России, предлагая схемы, направленные на реализацию интересов Великобритании.*

«Страсти, которые натравливают народы друг на друга и разрушают цивилизацию, уходят корнями в невежество, порожденное изоляцией. И эта изоляция – это не просто изоляция одной нации от другой, но и не в меньшей степени от умонастроений, которые развиваются внутри каждого национального сообщества» [1, p. VI]. Так писал в 1920 году английский историк Харолд Темперли, рассуждая о причинах только что завершившегося масштабного конфликта. Изучение таких «умонастроений» является, на наш взгляд, и сегодня важной исследовательской задачей исторической науки, решение которой должно обеспечить взаимопонимание и продуктивное взаимодействие между отдельными странами на основе понимания исторического прошлого. При этом не менее важно изучение позиций отдельных исторических личностей, имевших значительное влияние на принятия решений с далекоидущим эффектом.